**Капшуль, А.** Памяць патрэбна не мёртвым. Памяць патрэбна жывым / А. Капшуль // Глыбоцкі веснік. — 2000. — 27 верас. — С. 2.

## ПАМЯЦЬ ПАТРЭБНА НЕ МЁРТВЫМ. ПАМЯЦЬ ПАТРЭБНА ЖЫВЫМ

*16 верасня ў нашым горадзе адбылося ўрачыстае адкрыццё помніка воінам-інтэрнацыяналістам, які ўстаноўлены ў парку Перамогі. У гэты дзенъ роўна 11 год і 7 месяцаў назад з Афганістана былі выведзены апошнія воінскія часці. І для соцен беларускіх сем'яў скончыўся жах той страшной вайны. Многія знайшлі, нарэшце, душэўны спакой. А нехта, так і не дачакаўся сваіх сыноў, братоў і мужоў. Не мінуў гэты боль і жыхароў Глыбоцкага раёна. Пяцёра наших землякоу загінулі, выконваючы воінскі абавязак у Афганістане.*

Першае паведамленне аб смерці Аляксандра Дзехцярова прыйшло 20 год назад у вёску Перадолы. Праз два гады бяда не абышла сям'ю Сандзюкоў з вёскі Стуканы – загінуў Леанід. А неўзабаве прыйшлі пахаронкі ў вёску Завулак і ў Глыбокае. Родныя аплаківалі Аляксандра Чаронку і Дзмітрыя Батуру. Апошняе паведамленне аб смерці нашага земляка Рамана Мацеюна, ураджэнца Карабоўскага сельсавета, датавана кастрычнікам 1987 года. Усе загінуўшыя пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам «Чырвонай Зоркі».

Былыя воіны-інтэрнацыяналісты, а іх пражывае ў раёне 121 чалавек, у дзень адкрыцця помніка ў дзесятай гадзіне раніцы сабраліся ў зале пасяджэнняў Дома Саветаў. Да іх далучыліся родныя тых воінаў, чыё жыццё абарвалася на чужыне. На сустрэчу прыбылі: старшыня рэспубліканскага Саюза ветэранаў вайны ў Афганістане С. М. Гаварушкін, старшыня абласной арганізацыі ветэранаў вайны ў Афганістане А. Б. Гудкоў, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь В. П. Хрол, аўтар помніка, скульптар У. І. Жбанаў і яго сааўтар А. Л. Козел, работнікі райвыканкама на чале з яго старшынёй М. М. Кандзерскім. З уступным словам да прысутных звярнуўся намеснік старшыні райвыканкама М. Л. Чарапкоўскі. Ён гаварыў пра тое, што Глыбоччына свята захоўвае памяць пра тых сваіх землякоў, якіх сёння няма з намі побач. Воінаў-інтэрнацыяналістаў вітаў дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь В. П. Хрол. Ён выканаў ганаровую місію – ўручыў прысутным юбілейныя медалі «55 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне». Гэтую ўзнагароду атрымалі і родныя загінуўшых воінаў-афганцаў. Слова ад воінаў-інтэрнацыяналістаў узяў І. У. Федаровіч. Ад сябе асабіста і ад імя сваіх сяброў-афганцаў ён падзякваў кіраўніцтву раёна за ўвагу і клопат, якімі не абдзелены воіны-інтэрнацыяналісты.

Затым дзеянне перанеслася на месца правядзення ўрачыстасці. Прыгожай калонай, пад гукі духавога аркестра рушылі яе ўдзельнікі ў парк Перамогі. Ля помніка ў ганаровай варце застылі воіны, а ўздоўж дарожкі – дзяўчаты ў жалобных хусцінах з запаленымі свечкамі ўвасаблялі смутак, жалобу і боль. Ля падножжа помніка на мармуровай дошцы надпіс: «Светлай памяці землякоў-глыбачан воінаў-інтэрнацыяналістаў, загінуўшых у імя Айчыны».

Вядучы паступова набліжае самы хвалюючы момант, даючы слона арганізатарам урачыстасці, гасцям. І першым да мікрафона падыходзіць намеснік старшыні райвыканкама М. П. Чарапкоўскі. Ён дзячыць усім, хто дапамог наблізіць гэты дзіўны дзень: аўтару і сааўтару помніка, будаўнікам ПМК-49 і, у прыватнасці, яго начальніку В. Л. Якубёнку, тым, хто падтрымліваў фінансава і маральна.

Аб мужнасці і гераізме сваіх землякоў, якія загінулі пры выкананні воінскага абавязку, аб лёсах воінаў-інтэрнацыяналістаў і аб тым, што Афганістан, нягледзячы на час, па-ранейшаму трывожыць іх душы, гаварыў старшыня райвыканкама М. М. Кандзерскі. Пасля таго як была перарэзана чырвоная стужка, салдаты тройчы далі залп. Зноў і зноў да мікрафона сталі падыходзіць тыя, для каго тэма афганскай вайны болем адгукаецця у сэрцы. Слова меў Станіслаў Гаварушкін і скульптар, у мінулым афганец, Уладзімір Жбанаў, старшыня раённага Савета ветэранаў вайны ў Афганістане А. П. Ждановіч, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь В. П. Хрол, брат загінуўшага Рамана Мацеюна – Артур Іосіфавіч Мацяюн, які праз тры месяцы пасля смерці брата сам аказаўся ў Афганістане.

Хвіліна маўчання, па заканчэнні якой народная акадэмічная капэла гарадскога Дома культуры выканала малітву, адбылося асвячэнне помніка. Урачыстасць усхвалявала многіх прысутных. Людзі не саромеліся слёз, а да падножжа скульптуры клаліся жывыя кветкі. Апошнімі сваю пашану аддалі вайскоўцы. Яны, прыгожа чаканячы крок, прайшлі строем ля помніка.

**А. Капшуль**